г.Пинск, ул.Днепровской
флотилии, д.21, к. 19.

№ 92 (2046). 25 лістапада 2008 года. Аўторак. Тыраж 6624

Пинский межрайонный центр по гидрометеорологии и мониторингу окружающей среды.

# «ВЕЧНАЯ ПРАГА КРЫЛА — ВЕРА І СІЛА ПАЛЁТУ»

**У пажоўклых садах над Ясельдай зачырванела каліна. Людзі кажуць: «Надышоў Жэнін лістапад». На мінулым тыдні адзначалася 60-я гадавіна нараджэння Яўгеніі ЯНІШЧЫЦ. Прайшло ўжо шмат часу, як развіталіся мы з ёю, выдатнай паэтэсай, уганараванай дзяржаўнымі прэміямі і ўзнагародамі, і проста Чалавекам са светлай і шчырай душой, з добрым і адкрытым сэрцам. Нам засталіся яе дзівосныя, спеўныя творы і памяць аб прыгожай, незабыўнай жанчыне, высокі талент якой акрыляе, натхняе, вабіць да высокіх пачуццяў.**



Урачыстасці у Парэцкай школе.



Да роднага дому паэткі.





*Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР (справа) віншуе лаўрэата літаратурнай прэміі паэта Алеся КАСКО.*

***«Паэзія. Душа. Айчына. Маланка з громам. Бура. Ціш»***

Двухдзённыя святочныя літаратурныя мерапрыемствы пачаліся ў Пінскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я.Янішчыц. Тут сабраліся прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, госці з Мінска. Да ўрачыстасцей далучыліся сын Яўгеніі Іосіфаўны Андрэй і яе пляменніца Таццяна Ганчарык.

З прывітальнай прамовай звярнуўся намеснік старшыні Пінскага райвыканкама І.Багатка. «З вялікім узрушэннем мы адзначаем знамянальную падзею для Піншчыны, Берасцейшчыны і ўсёй краіны, напоўненую духам гонару за нашу таленавітую зямлячку, — адзначыў Іван Мікалаевіч. — Падрыхтоўка да юбілею дала магутны імпульс да далейшага развіцця Пінскага раёна, узмацніла працоўны энтузіязм і дзелавы настрой яго жыхароў, добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Асаблівая ўвага была ўдзелена вёскам Рудка, Велясніца, Парэчча. Земляні паэтэсы разам з намі з годнасцю сустракаюць знамянальны юбілей». Як вядома, 2008 год на Піншчыне быў аб'яўлены літаратурным годам Я.Янішчыц, у межах якога бібліятэкі выконвалі тэматычную праграму «Пад зоркай Яўгеніі Янішчыц». Да палескіх дзён свята і жальбы рыхтаваліся супрацоўнікі ўстаноў культуры, паэты і пісьменнікі, грамадскасць. Адна з такіх агульных спраў — выданне тэматычнага нумара літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса «Нёман». Ён амаль цалкам прысвечаны Я.Янішчыц. У нумары змешчаны і творы мясцовых літаратараў, даследчыкаў, журналістаў. Гэта ўжо другі выпуск так званага «Пінскага сшытка». Прэзентацыя лістападаўскага «Нёмана» адбылася ў раённай бібліятэцы. Пра сваю працу распавядалі супрацоўнікі выдання. Яго галоўны рэдактар Міхась Пазнякоў, між іншым, выказаў задаволенасць супрацоўніцтвам з таленавітымі пінскімі аўтарамі, мясцовымі ўладамі, якія вельмі спрыяюць папулярызацыі культурнага жыцця горада і раёна.

Далейшы працяг урачыстасцей адбыўся ўжо на радзіме Янішчыц, каб прынікнуць сэрцам да тых вытокаў, што жывілі талент нашай ясяльдзяначкі.

***«Прыедзь у край мой ціхі, Тут продкаў галасы...»***

Пачалося падарожжа па мясцінах, дзе памятаюць Жэніна дзяцінства і юнацтва. Да акенцаў яе асірацелай бацькоўскай хаты ў вёсцы Рудка былі ўскладзены кветкі. Прырода быццам суперажывала з людзьмі: «Як Дастаеўскі, схмарылася неба», накрапваў дожджык.

Яшчэ адна памятная падзея чакала ў Парэцкай школе, дзе вучылася і рабіла першыя крокі да майстэрства слова будучая «палеская ластаўка». Вось ужо дзесяць гадоў у гэтых сценах існуе літаратурны музей, якім кіруе настаўніца беларускай мовы і літаратуры, знаўца жыцця і творчасці паэтэсы Антаніна Сідарук. Сёлета рашэннем Брэсцкага аблвыканкама навучальнай установе прысвоена імя Я.І.Янішчыц. Аб гэтым будзе ўзгадваць мемарыяльная дошка, якую падчас урачыстасцей адкрылі намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Васіль Агіевіч, старшыня раённага Савета дэпутатаў Фёдар Каральчук, сябра праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Раіса Баравікова, начальнік аддзела адукацыі райвыканкама Валянціна Бягеба. На спатканне з гасцямі прыйшла адна са школьных настаўніц Жэні Янішчыц Марыя Аляксееўна Астахава.



*Пінскія сустрэчы. Злева направа: паэт Мікалай ЛАЎРОВІЧ, Андрэй ЯНІШЧЫЦ, рэдактар часопіса «Маладосць» Раіса БАРАВІКОВА.*

Узнёслы і разам з тым гаркотны настрой яднаў прысутных на паэтычнай вечарыне «Каб застацца ў нязменнай любові — табе», што адбылася ў Велясніцкім сельскім клубе. У паэзіі, музыцы, фотамастацтве, успамінах маляваўся натхнёны і трагічны вобраз сапраўднае творцы. У такія моманты асабліва востра, амаль фізічна адчуваеш сэнс слоў: «Асоба паэткі кранаецца зямлі, але жыве ў небе». Чым вызначаецца рэчаіснасць?

(Заканчэнне на 2-й с.).

# «ВЕЧНАЯ ПРАГА КРЫЛА — ВЕРА І СІЛА ПАЛЁТУ»




◄ *«Ты пакліч мяне, пазаві...». Песню на словы Я.Янішчыц выконвае Ігар КАРАТКЕВІЧ (в. Парахонск).*



*Лістападаўскі нумар часопіса «Нёман» прэзентуе рэдактар выдання Міхась ПАЗНЯКОЎ.* ►

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й с.).

***«...Гэты лёс,***
***гэты ўскрык жураўліны,***
***І прасцёртага шляху***
***далонь.***
***Будзе сёлета***
***многа каліны, —***
***Закіпай жа,***
***сардэчны агонь!»***

Свята пісьменства і духоўнасці не скончылася. Да ўрачыстасцей з нагоды 60-годдзя з дня нараджэння Я.Янішчыц было прымеркавана правядзенне ў Палескім тэатры драмы цэрымоніі ўзнагароджвання літаратурнай прэміяй імя празаіка, прафесара Брэсцкага педагагічнага інстытута Уладзіміра Калесніка (1922-1994). Яе заснавальнікам з'яўляецца Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт. Як адзначыў старшыня аблвыканкама Канстанцін Сумар, стварэнне прэміі актывізуе творчае жыццё Берасцейшчыны, а яе існаванне павінна пацвердзіць ідэі пра тое, што кожны чалавек творчага складу, які ахвяруе свой талент Бацькаўшчыне, будзе мець спрыяльнасць з боку дзяржавы ў сваёй творчасці. У розных намінацыях лаўрэатамі вызначаны паэты Міхась Рудкоўскі (пасмяротна), Алесь Каско і Мікола Пракаповіч за сумесную кнігу «Трохперсце», даследчыца беларускай міфалогіі Зінаіда Дудзюк («Кола Сварога»), пісьменнік-дакументаліст Васіль Ласковіч («Отзвук далекой грозы»), аўтар твораў для дзяцей Расціслаў Бензярук («Зайцаў кажушок»). Былі і яшчэ ўзнагароды. Брэсцкае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі сумесна з філалагічным факультэтам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна праводзілі конкурс творчых і літаратурна-даследчых работ сярод дзяцей і моладзі, прысвечаных 60-годдзю з дня нараджэння Я.Янішчыц. Прыемна адзначыць, што сярод дыпламантаў ёсць і пінчане: Вольга Грабар (СШ № 17), Вольга Курдзюмава (СШ № 12) і Аляксандр Хоміч (СШ № 6). А пераможцай у творчым спаборніцтве стала вучаніца Мерчыцкай сярэдняй школы Пінскага раёна Альбіна Драка. Некалі яе сям'я жыла ў тым доме, дзе нарадзілася Яўгенія Янішчыц, дзе прайшлі гады яе дзяцінства, і сённяшняя школьніца выказала свае пачуцці да вядомай асобы.



*Беларускія літаратары Валянціна КОЎТУН, Крысціна ЛЯЛЬКО, Анатоль ВЯРЦІНСКІ.*

Звяртаючыся да ўсіх прысутных, старшыня аблвыканкама К.А.Сумар нагадаў, што мастацтва, літаратура павінны дапамагаць пераадольваць негатыўныя працэсы ў грамадстве, а «прафесіяналы і аматары прыгожага пісьменства ўсведамляць свой абавязак перад Айчынай і яе народам». Размову працягвалі дырэктар рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і Мастацтва» Алесь Карлюкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Раіса Баравікова, старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Крэйдзіч, дацэнт Брэсцкага дзяржуніверсітэта Уладзімір Сенькавец, дырэктар абласной бібліятэкі імя М.Горкага Тамара Данілюк, галоўны рэдактар «Народнай газеты» Уладзімір Андрыевіч.

Так прайшлі дні, напоўненыя радасцю жыцця і жалем па нязменнай страце. Сёння, 25 лістапада, споўніцца 20 год, як няма з намі Яўгеніі Іосіфаўны. І шмат з тых, хто цяпер адзначаў на Палессі Жэнін дзень нараджэння, прыйдуць з кветкамі да яе астатняга прытулка на ўсходніх могілках сталіцы.

Творчасць Я.Янішчыц існуе ў бязмежжы прасторы і часу і сёння пабуджае людзей думаць і суперажываць, любіць родны край, мову і культуру свайго народу, жыць у сяброўстве і згодзе.



◄ *Вучні пінскіх школ, дыпламанты дзіцячага літаратурнага конкурса (злева направа) Аляксандр ХОМІЧ, Вольга КУРДЗЮМАВА, Вольга ГРАБАР.*

***«Маё аблічча —***
***толькі форма,***
***Адлітая для струн душы».***

**Вячаслаў ІЛЬЯНКОЎ.**
**Фота аўтара.**